Бярозаўскага р-на Ханты-Мансійскай нац. акругі (1975) і інш. Творы М. вызначаюцца лаканічнасцю пластычнай мовы, псіхалагізмам вобразаў.

**МУРЗО́** Сяргей (1912 — ?), беларускі сав. паэт. Скончыў Бел. вышэйшы пед. ін-т (1934). У канцы 20 — пач. 30-х г. рабочы-токар на Віцебскім станкабуд. з-дзе імя Камінтэрна. Чл. *Віцебскай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў.* Друкаваўся з 1929 у газ. «Віцебскі пралетарый», «Чырвоная змена», зборніку «Рытмы будавання» (1931, Віцебск), час. «Чырвоная Беларусь» і інш. выданнях. Большасць вершаў прысвяціў жыццю і працы рабочых («Ля сталёвых бліскучых станін», «Вясна ў ліцейнай», «Вечар» і інш.). *С. П. Шушкевіч.*

**МУРО́ЎКА,** размяшчэнне камянёў, каменных блокаў, цэглы ў пэўнай сістэме, якая выяўляецца малюнкам швоў па паверхні сцяны. Удасканальванне тэхнікі М., выкарыстанне розных тыпаў цэглы, сістэма злучэння цаглін паміж сабой адлюстроўваюць узровень развіцця буд-ва і даюць магчымасць стварыць



Муроўка «разынкавая». 19 — пач. 20 ст.

дакладную шкалу для датавання помніка архітэктуры. Малюнак М. неатынкаваных фасадаў з'яўляецца асн. фактарам паліхроміі ў манум. дойлідстве. Для арх.-буд. практыкі пэўнай эпохі і рэгіёна ўласцівы асобныя сістэмы М.

М. вядома са старажытнасці. На тэр. Беларусі існавалі мяшаная (з камянёў і цэглы), цагляная і каменная М. Першае на Беларусі збудаванне ў тэхніцы мяшанай М. (opus mixtum) — *Полацкі Сафійскі сабор* (11 ст.). Пластыку фасадаў узбагачалі чаргаванне радоў камянёў са слаямі *плінфы*, якая звязвала канструкцыю М. Такая сістэма перавязкі плінфы атрымала назву М. са «схаваным радам». Для *Полацкай школы дойлідства* (12 ст.) характэрна таксама М. са «схаваным радам», якая ўтварала 2-колерную гаму паверхні сцяны. У тэхніцы каменнай М. (opus incertum) пабудавана *Мінская замкавая царква* (12 ст.). Яе сцены ў сярэдзіне выкладвалі камянямі, а вонкавую паверхню абкладалі невял. прамавугольнымі блокамі вапняку. У тэхніцы дэкар. мяшанай М. пабудавана *Віцебская Благавешчанская царква* (12 ст.). Яе сцены мелі радавую М.: 1 рад ачасанага вапняку, 2 рады плінфы і г. д. Знадворку сцены былі апрацаваны тонкім слоем тынкоўкі і падзелены белымі вапнавымі палоскамі (шырыня палосак каля 1,5 см) на русты адпаведна памерам часанага вапняку. Для *Гродзенскай школы дойлідства* (12 ст.) характэрна дэкар. раўнарадавая М., акрамя плінфы вонкавую паверхню сцен аздаблялі рознакаляровыя шліфаваныя камяні, паліваныя пліткі, з якіх выкладваліся розныя крыжападобныя фігуры. У інтэр'еры сцены мелі роўную паверхню з плінфы, на іх фоне вылучаліся круглыя гарлавіны *галаснікоў*. У тэхніцы раўнарадавай М., калі асн. частка сцен рабілася з плінфы, пабудаваны ў 12 ст. храм у Тураве. У 13—17 ст. ужывалася лусковая М., калі з цэглы ці спецыяльна падабраных камянёў выкладвалі вонкавыя паверхні сцен, а прамежкі паміж імі забутоўвалі кавалкамі цэглы і дробным каменнем *(Камянецкая вежа, Гальшанскі палац)*. Для 2-й пал. 13— сярэдзіны 14 ст. характэрна цагляная балтыйская М. з чаргаваннем 2—3 лажкоў і тычка цэглы *(Крэўскі замак)*. У 1-й пал. 14 ст. існавала каменная М. grand appareil *(Лідскі замак)*. У 16—17 ст. практыкавалі 2 тыпы мяшанай М.: чаргаванне суцэльных радоў камянёў і цэглы і хаатычна раскіданыя валуны па складзенай з цэглы паверхні *(Гродзенскі стары замак, Мірскі замак)*. З сярэдзіны 14 ст. да сярэдзіны 16 ст. пераважала цагляная гатычная М. з чаргаваннем у радзе тычка і лажка *(Сынковіцкая царква-крэпасць)*. З 15 ст. пашырылася дэкар. гатычная М., дзе выкарыстоўвалася перапаленая цэгла-клінкер (цёмна-сіняга. амаль чорнага колеру), з якой выкладвалі розныя ўзоры, найчасцей у выглядзе рамбічнай сеткі *(Ішкалдскі Троіцкі касцёл)*. У 2-й пал. 16 ст. з'явілася рэнесансавая М. (чаргаванне радоў з тычкоў і лажкоў цэглы). У 16—17 ст. ужываецца крыжовы варыянт рэнесансавай М., калі швы стыкаў лажкоў знаходзяцца адзін над адным у кожным 5-м радзе цэглы *(Заслаўская Спаса-Праабражэнская царква)*. У 17—18 ст. вядома таксама галандская М., у якой рады з тычкоў чаргуюцца з радамі, дзе тычок чаргуецца з лажком *(Мсціслаўскі касцёл і калегіум езуітаў)*. У фартыфікацыйным буд-ве 16—18 ст. выкарыстоўвалася тычковая М. *(Мураванкаўская царква-крэпасць)*. З 2-й пал. 16 ст. фасады будынкаў атынкоўваліся, што прывяло ў 17 ст. да адраджэння раўнарадавай М. (збудаванні Магілёўскай арх. школы).

У 19 — пач. 20 ст. ў збудаваннях архітэктуры стыляў рамантызму, несапраўднай готыкі, «мадэрн» і інш. выкарыстоўваюцца розныя тыпы М., але найчасцей гатычная *(Галавічпольская сядзіба, Чырвонабярэжская сядзіба, Мінскай жаночай гімназіі будынак)*. Для архітэктуры невял. капліц, касцёлаў, цэркваў, мураваных агароджаў гасп. пабудоў 19—20 ст. характэрна т. зв. «разынкавая» М., калі вял. камяні абмазваліся вапнай і ў яе ўтыкаліся дробныя каменьчыкі, здалёк падобныя на разынкі, часам з іх выкладваліся розныя ўзоры (агароджа каля царквы-крэпасці ў Сынкавічах Зэльвенскага р-на, царква ў в. Беніца Маладзечанскага р-на). У сучаснай архітэктуры практыкуецца мяшаная, цагляная і каменная М. з выкарыстаннем прыродных і штучных (бетонныя блокі, керамічныя пліты, абліцовачная цэгла) матэрыялаў. Дэкаратыўны эфект М. дасягаецца сістэмай перавязкі цаглін паміж сабой, камбінацыяй колераў і фактуры цэглы.

*Літ.:* Пазняк З. Беларускі каменны арнамент.— Маладосць, 1968, № 12; Трусов О. А. Основные типы кладки XI — XII вв. на территории Белоруссии.— У кн.: Древнерусское государство и славяне. Мн., 1983. *А. А. Трусаў.*